**ЭКСКУРСІЯ “ Жыццё і побыт беларусаў у XIX стагоддзі”**

**1 экскурсавод:**

Уздыхаць па старых рэчах, вяртацца да старога ўкладу жыцця не варта, але ведаць, як жылі нашы дзяды-прадзеды, трэба. А пры святле свечкі на покуці ў бацькоўскай хаце, пры святле малітвы ў душы відаць і тое, што засталося ў мінулым, і ясніцца шлях у будучыню.

**2 экскурсавод:**

Сёння Вас запрашае да сабе ў госці сялянская хата. Прыветна вокны пазіраюць, нібыта ў госці запрашаюць. Ну, добры выгляд хата мае. Цікава... Што ж нас тут чакае? (гаспадар і гаспадыня)

Пры ўваходзе ў хату нас сустракае печ. Яна займала ў сялянскай хаце важнае і пачэснае месца. Абагравала хату, у ёй варылі ежу, на ёй спалі, адпачывалі, лячыліся.

Да печы адносіліся як да жывой істоты. Забаранялася ўжываць «у яе прысутнасці» грубыя або непрыстойныя словы: «Няможна гэтак казаць, бо печ у хаце», «Сказаў бы, ды печ у хаце».Каля печы знаходзіўся качарэжнік.Тут стаяў пячны інвентар-качарга. Вілы,чапяла і абавязкова хлебная лапата.(**Паказваем лапату)** Лапата займала асобнае месца сярод хатніх рэчаў.Магчыма таму, ўто яна мела дачыненне да хлеба.Ёй надавалі ахоўныя якасці: у час навальніцы ,каб зберагчы свае будынкі ад маланкі,хлебную лапату выстаўлялі на двор.

2. Ёсць у вясковай хаце месца, дзе пасядзець лічыцца за вялікі гонар. Покуць - так называецца гэта пачэснае месца ў хаце, не забытай Богам.***(Падыходзіць, усё паказвае)***

Покуць спрадвеку ачышчала і ўзвышала чалавека, рабіла яго лепшым. Прыходзіла свята, Каляды ці Вялікдзень,і на покуці першы садзіўся гаспадар, а злева ад яго астатнія сямейнікі. І не абы як, уперамешку, а па старшынству, дарослыя і дзеці. Маліліся , успаміналі добрым словам дзядоў - прадзедаў, частаваліся.

Покуць - гэта куточак храма ў хаце. Уверсе, пад самай столлю, вісяць абразы - з выявамі Ісуса Хрыста і святых. Яны маўклівую малітвую асвячаюць хату і жыццё людзей у гэтай хаце

Покуць прыгожа ўбіраецца. На абразы гаспадыня вешае ўзорныя ручнікі - набожнікі. .На покуці мясціліся стол і лава.Стол выконваў ролю своеасаблівага хатняга алтара, таму ставіліся да яго з павгай і дапусціць на стол ката лічылася вялікім грахом, бо тут заўсёды знаходзіліся хлеб ды соль.

1. Ажыўлялі вясковую хату рэчы, зробленыя рукамі гаспадароў і вясковых умельцаў.***( Падыходзіць і паказвае)***Гэта дзяжа. Няцяжка здагадацца, чаму гэтую рэч называлі хлебніцаю. У ёй заквашвалі цеста, з якога пяклі духмяны хлеб. Цеста ў дзяжы варушылася, расло, як жывое. Прасілася ў печ. Дзяжу ў вёсцы шанавалі. Пры ўваходзінах яе першай уносілі ў хату, каб не зводзіўся хлеб на стале.

2. А вось перад вамі бойка. ***(Падыходзіць і паказвае)*** Калі малако адстойвалася ў збанках, гаспадыня збірала зверху смятану – густы, тлусты слой . Назапашвала смятаны ўдосталь і біла з яе ў бойцы масла.

   Масла білі ўручную. Калатоўка шпарка бегала зверху-ўніз, знізу-ўверх. Бегала доўга і без перадыху, каб смятана ў бойцы не астыла. Збіўшы масла, злівалі ў збанкі маслёнку. Кіславатая, з залацістымі крупінкамі масла, яна смачна сёрбалася потым з цёплаю бульбаю.

1. Прыгадваецца казка пра дзвюх жабак, якія трапілі ў пастку – збанок са смятанаю. Адна жабка адразу выдыхнулася, здалася і патанула ў смятане. А другая, упартая, доўга працавала лапкамі, як калатоўкаю, і збіла са смятаны масла. Стала на грудку масла і выскачыла са збанка на волю. Казка цікавая і павучальная: ніколі не падайце духам, сябры, верце ў свае сілы – і зможаце выбрацца з любой пасткі.

2. Звярніце, калі ласка **,** увагу на гліняны посуд. Ён і сёння карыстаецца попытам. Прыгожа глядзіцца ён і на кухоннай паліцы, і на абедзенным стале.А ў нашых прашчураў гліняныя вырабы былі на любы густ, для розных патрэб.

   Гэта – збанок ***(падыходзіць і паказвае)*** Пасудзіна добра вядомая. У ім звычайна трымалі малако: доўга не скісае, а ў гарачыню – халоднае. Мае ручку і носік-дзюбку, каб тое ж малако лёгка, роўным струменьчыкам лілося ў міску ці ў кубак.

   Гарлач ***(падыходзіць і паказвае)*** старэйшы за збан. Яны падобныя, як браты, толькі гарлач без ручкіі не мае носіка-дзюбкі зверху.

   З посуду прыцягвае ўвагу спарыш ***(падыходзіць і паказвае)***, які складаецца з двух ці трох гліняных гаршчочкаў. Навошта яны былі патрэбны? Калі бацька з сынам працавалі ў полі, жанчына ці дачка, загарнуўшы ў фартушок, несла ім ежу. Кожная страва была ў асобным гаршчочку.

**1.**У кожным двары абжывалася цэлае сямейства кашоў, старых і новых, вялікіх і малых. Без іх, лёгкіх і зручных, не абыходзіліся ні дарослыя, ні дзеці. ***(Падыходзіць і паказвае)*** У кашах з плеценымі вечкамі захоўвалі сушаныя каўбасы, паляндвіцы, кумпякі.

2. У кожнай сялянскай хаце можна было ўбачыць зручны абутак, плецены з лыка, лазовай кары, бяросты . Лыка дралі найчасцей з маладой ліпы, сушылі ў клеці або на гарышчы хаты. Потым палоскі кары, каб яны не ламаліся, размочвалі ў цёплай вадзе. І плялі лапці. ***(Падыходзіць і паказвае)***

   Плялі лапці звычайна мужчыны. Сярод іх былі сапраўдныя майстры: сплеценыя імі лапці, лёгкія і зграбныя, прыгожа глядзеліся на любой назе. У іх добра было і на працы, і ў танцы.

   З лазы плялі і вярэнькі. Імі карысталіся, калі трэба было несці на поле ежу, пасвіць кароў, касіць.Вось сявенькі, сплеценыя з пруцікаў лазы.З іх сеялі збожжа.Тут і цапы, якімі малацілі зерне. А гэта начоўкі, у якіх гаспадыні пралі бялізну і купалі дзяцей.

1. Быў час, калі ў вёсцы ўсе былі папрадухамі: маці вучыла прасці дачку, бабка – унучку. Вы бачыце таксама некаторыя прылады для ткацтва, у прыватнасці

грэбень,на якім жанчыны пралі кудзелю ***(Падыходзіць і паказвае)*** Папрадуха левай рукою выцягвае з барады валасінкі ,а правай круціць верацяно, навіваючы на яго нітку.Потым іх маталі ў клубкі, затым сукалі цэўкі .Цэўкі закладвалі ў чоўнік , а зімою снавалі і ткалі кросны.

2. На пачатку 20 стагоддзя інтэр'ер хаты паступова набываў новы рысы.Адышлі ў нябыт пол і палаці , а на змену ім прыйшлі ложкі, што вы і бачыце ў нашым музеі. Для зручнасці гаспадыні каля ложка падвешвалі кальбель для немаўляці, каб можна было і кудзелю прасці, і дзіця бясшумна калыхаць.
3. Хоць і цяжка жылося нашым продкам, але не страцілі яны пачуцця прыгожага.Звярніце ,калі ласка, увагу, якую вопратку насілі сяляне нашай вёскі.Усё рабілі сваімі рукамі, пачынаючы ад саматканай тканіны да ўзораў вышыўкі на ручніках і посцілках. Ввочы разбягаюцца ад стракатай прыгажосці кашуль і фартушкоў, посцілак і абрусаў, ручнікоў і розных намітак. Не, такіх абноў у краме не купіш: у іх – жыццё, натхненне, душа таленавітых народных майстрых.

   Ручнікі не толькі ўпрыгожвалі інтэр'ер хаты, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах. На вяселлі хлебам-соллю на ручніку сустракалі маладых пасля вянчання ў царкве. Ужываўся ручнік і ў якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Адыходзячы ад аналоя, нявеста старалася цягнуць за сабой і ручнік. Гэта рабілася для таго, каб сяброўкі цягнуліся за ёю, выходзілі замуж. Самых паважаных гасцей падчас урачыстасцей і зараз сустракаюць хлебам-соллю на прыгожых ручніках.
2. Узорныя посцілкі сталі ткаць значна пазней, чым ручнікі і абрусы, бо ложкі ўвайшлі ў быт сялян вельмі позна. Але мастацкае аздабленне іх досыць высокае. Рознымі колерамі вясёлкі, шматлікімі ўзорамі радуюць нас гэтыя вырабы.
3. Існуе такая легенда. Чалавеку сказалі, каб ён, адыходзячы з хаты, не азіраўся назад, іначай ператворыцца ў слуп солі. Чалавек не стрымаў слова і азірнуўся... Дый як жа не азірнешся, калі родная сядзіба – гэта цэлы свет.
4. Часцей азірайцеся, сябры, назад, у мінулае, каб не пагасла свечка на покуці – у бацькоўскай хаце, каб лягчэй было ісці наперад, у будучыню. Дзякуем за ўвагу!